**Назва ТВП:** Балота Спораўскае







© С. Левый

**Код:** BY022

**Геаграфічныя каардынаты:** 52°24' N 25°18' E

**Адміністрацыйная прыналежнасць:** Брэсцкая вобласць: Бярозаўскі раён, Драгічынскі раён, Іванаўскі раён, Івацэвіцкі раён

**Плошча:** 20169 га

**Крытэрыі:** A1, B2, B3

**Нацыянальны прыродаахоўны статус:** ландшафтны заказнік рэспубліканскага значэння «Спораўскі»

**Міжнародны прыродаахоўны статус:** ТВП міжнароднага значэння, утворана ў 1998 годзе. Рамсарская тэрыторыя з 1999 г. (крытэрыі 1, 2)

## Агульнае апісанне:

Тэрыторыя ўяўляе сабой адзін з буйнейшых у Еўропе комплекс пойменных нізінных балот, якія захаваліся ў натуральным стане. Дзякуючы сваім памерам балотны масіў застаецца стабільнай экасістэмай, якая ў пэўнай ступені не залежыць ад змен на прылягаючых тэрыторыях.

У цэнтры заказніка працякае рака Ясельда з вельмі звілістым і зарослым воднай расліннасцю рэчышчам. Пойма шырынёй ад 0,5 да 2 кіламетраў з абодвух бакоў рэчышча ўяўляе сабой тыповае нізіннае балота. У цэнтры заказніка знаходзіцца возера Спораўскае. Асноўная частка тэрыторыі заказніка занята адкрытымі нізіннымі балотамі (43,2%), нізінныя балоты з мазаічна размешчанымі хмызнякамі займаюць 17,9% плошчы, на долю балот, парослых хмызнякамі, прыходзіцца 4,1%. Сярод балот раскіданы шматлікія невысокія пагоркі і ўзвышшы (мінеральныя астравы). У мінулым мінеральныя астравы былі пакрыты дубова-хваёвымі лясамі, але пазней іх высеклі і гэтыя ўчасткі сталі выкарыстоўваць у якасці выганаў і пашаў. У цяперашні час большая частка сельскагаспадарчых тэрыторый закінута і на іх аднаўляецца натуральная расліннасць.

Раней, да меліярацыі, гідралагічны рэжым ракі Ясельда быў тыповым для раўнінных рэк: кожную вясну бывала высокая паводка, якая змянялася летней межанню. На працягу ўсяго года здараліся рэдкія навадненні, выкліканыя ападкамі. У цяперашні час увесь участак ракі Ясельда вышэй заказніка выпрамлены і зарэгуляваны. На рацэ створаны вадасховішча і рыбгас «Сялец», ад дзейнасці якіх залежыць гідралагічны рэжым на тэрыторыі заказніка. У апошнія гады веснавыя паводкі адсутнічаюць, затое пачасціліся летнія навадненні. Парушэнне гідралагічнага рэжыму прыводзіць да інтэнсіўнага зарастання рэчышча ракі і возера, да штогодніх затапленняў поймы ці, наадварот, моцных засух і пажараў.

Забалочаная пойма характарызуецца ўнікальным, хаця і не вельмі багатым складам раслін. Адзначана крыху больш за 600 відаў раслін. Звязана гэта з тым, што нешматлікія ўзвышэнні рельефу (мінеральныя астравы), якія робяць больш разнастайнай бедную флору балот, у значнай ступені трансфармаваны. На тэрыторыі заказніка налічваецца 18 відаў раслін, занесеных у Чырвоную кнігу Беларусі, і 13 відаў, якія маюць рэгіянальную значнасць. Акрамя гэтага, тут адзначаны ўнікальныя супольнасці травяністай расліны булаваносца сівога Corynephoretum canescentis, якія прыстасаваліся да росту на сухіх пясчаных выспах ва ўмовах, неспрыяльных для выжывання іншых відаў раслін.

Тэрыторыя заказніка выкарыстоўваецца для наступных відаў гаспадарчай дзейнасці: сенакашэння і выпасу жывёлы (10-15% плошчы), лясной гаспадаркі, палявання і рыбнай лоўлі. На прылягаючых да ўгоддзя, у асноўным меліяраваных, землях вырошчваюцца прапашныя і зерневыя культуры.

## Асноўныя біятопы:

Нізінныя балоты – 51,1%, лясы – 32,8%, азёры, вадасховішчы, залітыя вадой торфавырабаткі, рэкі і каналы – 8,9%, лугі – 3,4%, іншыя біятопы - 2,8%.

## Птушкі:

Усяго на гнездаванні ў заказніку адзначана 123 віды птушак.

Тэрыторыя з'яўляецца вызначальным месцам гнездавання віда, які знаходзіцца пад глабальнай пагрозай знікнення вяртлявай чаротаўкі *Acrocephalus paludicola*. Тут гняздуецца каля 9% сусветнай папуляцыі і адзначана самая высокая ў свеце шчыльнасць гэтага віду. Заказнік забяспечвае існаванне папуляцый цэлага шэрагу рэдкіх і знікаючых відаў птушак, сярод якіх два віды (драч Crex crex і дубальт Gallinago media) таксама знаходзяцца пад глабальнай пагрозай знікнення, а 20 занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі. Акрамя гэтага, тэрыторыя заказніка падтрымлівае папуляцыю чаплі-бугая Botaurus stellaris, якая мае міжнародную значнасць, і папуляцыю чорнага бусла Ciconia nigra нацыянальнай значнасці.

## Іншыя групы жывел:

Фауна ТВП дастаткова разнастайная: 24 віда звяроў, 6 відаў рэптылій, 8 відаў амфібій, 34 віда рыб.

## Стан рэдкіх відаў птушак:

| Віды | Статус | Колькасць | Год/перыяд ацэнкі | Дакладнасць ацэнкі | Трэнды | Крытэрый ТВП |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Качка-шылахвостка *Anas acuta* | гн | 1-5 п | 2007 | Э | | |
| Чапля-бугай *Botaurus stellaris* | гн | 10-20 с | 2007 | Э | | |

| Віды | Статус | Колькасць | Год/перыяд ацэнкі | Дакладнасць ацэнкі | Трэнды | Крытерый ТВП |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Чапля-лазянік *Ixobrychus minutus* | гн | 5-10 п | 2007 | Э | | |
| Чапля вялікая белая *Casmerodius albus* | мг | + | 2007 | П | | |
| Чорны бусел *Ciconia nigra* | гн | 5 п | 2007 | Д | | |
| Арлан-белахвост *Haliaeetus albicilla* | зал | + | 2007 | Д | | |
| Арол-вужаед *Circaetus gallicus* | гн | 1-2 п | 2007 | Э | | |
| Лунь палявы *Circus cyaneus* | гн | 3 п | 2007 | Д | ↔ | |
| Малы арлец *Aquila pomarina* | гн | 1 п | 2007 | Д | ↔ | |
| Арлец вялікі *Aquila clanga* | гн | 1 п | 2002 | Д | ↓ | |
| Арлец вялікі *Aquila clanga* | гн | + | 2007, 2010 | Д | ↓ | |
| Сокал-пустальга *Falco tinnunculus* | гн | 1-2 п | 2007 | Э | | |

| Віды | Статус | Колькасць | Год/перыяд ацэнкі | Дакладнасць ацэнкі | Трэнды | Крытэрый ТВП |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Сокал-шуленак *Falco vespertinus* | мг | + | 2007 | П | | |
| Сокал-кабец *Falco subbuteo* | гн | 2-3 п | 2007 | Э | | |
| Пагоніч малы *Porzana parva* | гн | 20-30 п | 2007-2010 | Э | | |
| Драч *Crex crex* | гн | 15 с | 2010 | Д | | |
| Журавель шэры *Grus grus* | гн | 3-4 п | 2007 | Э | | |
| Баталён *Philomachus pugnax* | мг | + | 2007 | П | | |
| Стучок *Lymnocryptes minimus* | мг | + | 2007 | П | | |
| Дубальт *Gallinago media* | гн | 42-47 с | 2010 | Д | ↑ | A1 |
| Грыцук вялікі *Limosa limosa* | гн | 5-10 п | 2007 | Э | | A1 |
| Кулён вялікі *Numenius arquata* | гн | 2-5 п | 2007 | Э | | |
| Кулік-селянец *Tringa nebularia* | мг | + | 2007 | П | | |
| Чайка малая *Hydrocoloeus minutus* | гн | 5-15 п | 2007 | П | | B2 |

| Віды | Статус | Колькасць | Год/перыяд ацэнкі | Дакладнасць ацэнкі | Трэнды | Крытэрый ТВП |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Чайка шызая *Larus canus* | мг | + | 2007 | П | | |
| Крычка малая *Sternula albifrons* | зал | + | 2007 | П | | |
| Рыбачка белашчокая *Chlidonias hybrida* | гн | + | 2007 | П | | |
| Рыбачка чорная *Chlidonias niger* | гн | 100-200 п | 2007 | Э | | B2 |
| Сава балотная *Asio flammeus* | гн | 1-6 п | 2007 | Э | | |
| Звычайны зімародак *Alcedo atthis* | гн | 2-5 п | 2007 | Э | | |
| Дзяцел беласпінны *Dendrocopos leucotos* | гн | 5-10 п | 2007 | Э | | |
| Цвыркун салаўіны *Locustella luscinioides* | гн | 100-200 п | 2007 | Э | | B3 |
| Чаротаўка вяртлявая *Acrocephalus paludicola* | гн | 491-517 с | 2011 | Д | ↓ | A1 |

| Віды | Статус | Колькасць | Год/перыяд ацэнкі | Дакладнасць ацэнкі | Трэнды | Крытэрый ТВП |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Сініца вусатая *Panurus biarmicus* | гн | 10-20 п | 2007 | Э | | |

## Іншыя рэдкія і знаходзячыеся пад пагрозай знікнення віды:

Звяры: барсук*Melesmeles.*

Амфібіі: чаротавая рапуха *Bufocalamita*, грабеньчаты трытон *Trituruscristatus*.

Рэптыліі: балотная чарапаха *Emys orbicularis.*

Насякомыя: фіялетавы жужаль *Carabusviolaceus, з*алацістаямачны жужаль *Carabusclathratus,* жужаль менетрые *Carabusmenetriesi,* жужаль бляскучы *Carabus nitens,* рашэцісты жужаль *Carabuscancellatus,* баразнаваты слізняед*Chlaenius costulatus,* чатырохбаразнаваты слізняед*Chlaeniussulcicollis, п*рыгожая нехаленія *Nehalenniaspeciosa, п*ясчаны скакун *Cicindelaarenariaviennensis, з*вычайны мечнік *Conocephalusdiscolor,* сфагнавы вадамер*Gerrissphagnetorum.*

Расліны: пылкагалоўнік чырвоны *Cephalantherarubra*, ядрушка даўгарогая *Gymnadeniaconopsea*, венерын чаравічак сапраўдны *Cypripediumcalceolus*, касач сібірскі*Irissibirica*, падвей стройны *Eriophorumgracile*, асака ценявая *Carexumbrosa*, гарычка крыжападобная *Gentianacruciata*, граздоўнік многараздзельны *Botrychium multifidum*, лікападыела заліўная*Lycopodiellainundata*, тайнік яйцападобны *Listera ovata*, крапіва кіеўская*Urticakioviensis*, гайнік цёмна-чырвоны *Epipactisatrorubens*, чараўнік зеленакветкавы *Plathantherachlorantha*, верабейнік лекавы *Lithospermum officinale*, гарлачык белы *Nymphaeaalba*.

## Пагрозы:

- Нестабільнасць гідралагічнага рэжыму ракі Ясельда.
- Забруджванне вады цяжкімі металамі, пестыцыдамі, арганічнымі рэчывамі.
- Узворванне глебы на мінеральных астравах, дзе растуць рэдкія віды раслін.
- Скарачэнне сенакашэння з’яўляецца асноўнай прычынай зарастання адкрытых нізінных балот хмызнякамі.
- Штогоднае веснавое выпальванне расліннасці практыкуецца мясцовым

насельніцтвам і наносіць істотную страту біялагічнай разнастайнасці. Асабліва буйныя пашкоджанні адбываюцца ва ўмовах сухой вясны і адсутнасці паводак, калі разам з расліннасцю выпальваецца верхні пласт глебы, карэнні раслін і гінуць усе насякомыя. На такіх выпаленых балотах і лугах большасць відаў птушак перастае гнездавацца.

## Рэкамендацыі па захаванню:

У 2001 годзе распрацаваны план кіравання заказнікам «Спораўскі», у якім змешчаны рэкамендацыі па вырашэнню большасці пералічаных вышэй праблем. Асноўная ўвага ў плане ўдзелена вырашэнню праблем, звязаных з колькасцю і якасцю вады. З 2011 г. пачата механізаванае кашэнне тэрыторыі поймы, для прадухілення зарастання адкрытых балот хмызнякамі.

## Крыніцы інфармацыі:

Асабістыя паведамленні: Дамброўскі В.Ч., Малашэвіч У.У., Левы С.В.

Отчет по НИР на тему«Проведение учётов индикаторных видов животных в заказниках «Споровский», «Званец», «Средняя Припять» и «Простырь». Науч. Руководитель Карлионова Н.В., Минск., 2010. – 56 с.

План управления республиканским ландшафтным заказником «Споровский» (разработан ГНПО «НПЦ НАН Беларуси по биоресурсам», 2009 г.)

Скарбы прыроды Беларусі. – Мн.: Беларусь, 2005. – 215 с. (Інфармацыю падрыхтавалі: Вяргейчык Л.А., Грычык В.В., Казулін А.В., Парэйка А.А., Скуратовіч А.М., Сцепановіч Я.М., Фладэ М.)

**Складальнікі :** Левы С.В.

---

* *Выкарыстанне змешчанай тут неапублікаванай інфармацыі для навуковых публікацый без пісьмовай згоды яе аўтараў забаронена. У выпадку выкарыстання часткі кантэнту або старонкі цалкам на іншых інтэрнэт-рэсурсах, абавязковая спасылка на аўтараў і сайт iba.ptushki.org*